«Ад першадрукара Скарыны -да сучаснай беларускай кнігі»

# Гонар і слава Айчыны – Францыск Скарына.





*Прэзентацыя падрыхтавана калектывам Астрынскай гарпасялковай бібліятэкі.*

“Францыск Скарына быў сапраўды тытанічнай асобай, універсальным творцам, які паспяхова рэалізоўваў свае творчыя здольнасці ў такіх галінах духоўнай культуры, як літаратура, , мастацкі пераклад, філасофія, асвета, выдавецкая справа. Прызнаным аўтарытэтам быў ён у медыцыні і іншых галінах навукі. Улічваючы гэта, натуральна і заканамерна тое, што ён стаў пачынальнікам   нацыянальна-культурнага  і гуманіістычнага Адраджэння на беларускіх землях.”

*Дубянецкі  Э.С.*



У слаўным горадзе Полацку нарадзіўся ў сям'і купца Лукі Скарыны хлопчык, якому лёсам дадзена было праславіць і горад свой, і краіну сваю на ўвесь свет. Дакладна не вядомы сапраўдны год яго нараджэння: апошняя чвэрць 15 стагоддзя – называюць час нараджэньня Скарыны каля 1485—1490 гадоў. Пошук працягваецца…



Першапачатковую адукацыю Францішак Скарына атрымаў у Полацку. Хлопчыкі вучыліся ў школах пры каталіцкіх біскупскіх катэдрах і школах пры мужчынскіх кляштарах. Полацкі кляштар бэрнардынаў-абсэрвантаў быў і ў Полацку. Адным з галоўных было навучанне лацінскай мове. Потым падлетка сустракала сталіца ВКЛ Вільня, дзе ён працягваў сваю навуку. Пры катэдральнай школе выкладалі катэхізіс, а таксама трывіяльныя прадметы — граматыку, рыторыку і логіку. Выпускнікі школы нядрэнна размаўлялі лацінскай мовай і, калі жадалі, звычайна працягвалі сваю адукацыю ў Кракаўскім універсытэце[].



ПОЛАЦК НА ГРАВЮРЫ 16 СТАГОДДЗЯ.

У зімовы семестар 1504 года Францішак Скарына паступіў на навучаньне ў Кракаўскуі ўніверсітэт.на факультэт вольных мастацтваў або філасофіі.

«У рэктарства шаноўнага айца пана Яна Аміцына з Кракаву, доктара мастацтваў і кананічнага права, ласкаю Бога і апостальскага прастола біскупа лаодыцэнскага і суфрагана кракаўскага, а таксама плябана [касьцёла] сьвятога Мікалая па-за сьценамі Кракаву, у зімовы сэмэстар у год Пана 1504 наступныя асобы ўпісаныя... Францішак сын Лукі з Полацку 2 грошы»

Рэгістрацыйная кніга-метрыка Кракаўскага ўнівэрсытэту, 1504 г.




# ПАНАРАМА КРАКАВА

Спярша шкаляр вывучаў цыкл «трывіюм» (граматыка, рыторыка і логіка), потым «квадрырыюм» (арыфмэтыка, геаметрыя, астраномія і музыка)

Праз 2 гады, мінімальны час для студэнтаў філасофскага факультэту, у 1506 годзе ён вытрымаў экзамэн на ступень бакалаўра вольных мастацтваў.

У прамацыйнай кнізе ўніверсітэту захаваўся наступны запіс: *«У год Пана 1506, падчас дэканства Леанарда з Добшыц, бакаляўра кананічнага права… У тым жа годзе … у бліжэйшы дзень пасьля сьвята Сьв. Люцыі, на якое прыпадае сухаядзеньне, асобы, узьведзеныя ў ступень бакаляўра, былі разьмеркаваныя ў наступным парадку месцаў: …Францішак з Полацку, ліцьвін, …»*

Гэта адбылося 14 снежня 1506 года.



## КРАКАЎСКІ УНІВЕРСІТЭТ (СУЧАСНЫ ВЫГЛЯД)

Аб жыцці Ф.Скарыны з 1506 па 1512 год звестак няма. Але, . Падуанскія дакументы называюць Скарыну доктарам вольных навук і прафесарам. Каб атрымаць гэтае званне, неабходна было здаць магістарскі экзамен. Навукоўцы лічаць, што ён атрымаў дыплом у Кракаве, альбо ў Празе. Запіс у акце Падуанскага ўнівэрсітэту 9 лістапада 1512 году сведчыць пра тое, што ён быў сакратаром караля «Дацыі» («*secretarii regis Datiae*»).



Не пазней за восень 1512 году Францішак Скарына прыбыў у Італію, у Падую, каб атрымаць ступень доктара медыцыны.

«Найдастойнейшыя паны дактары! Прычына скліканьня вашамосьцяў наступная: прыбыў нейкі вельмі вучоны малады чалавек, доктар мастацтваў, бедны, родам з надзвычай далёкіх краёў, магчыма на чатыры тысячы міляў і больш ад гэтага слаўнага горада, дзеля таго, каб узьвялічыць славу і бляск Падуі, а таксама красуючай супольнасьці філёзафаў гімназіі і сьвятой нашай Калегіі. Ён зьвярнуўся да Калегіі з просьбай дазволіць яму ў якасьці дару і асаблівай міласьці падвергнуцца з ласкі Божай выпрабаваньням у галіне мэдыцыны пры гэтай сьвятой Калегіі. Калі, Вашамосьці, дазволіце, прадстаўляю яго самога. Малады чалавек і вышэйзгаданы доктар носіць імя пана Францішка, сына нябожчыка Лукі Скарыны з Полацку, русін.»

Тадэа Мусаці, царква Сьв. Урбана, Падуя. 5 лістапада 1512 г.



## ПАДУАНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ (СУЧАСНЫ ВЫГЛЯД)

. Паводле дакумента, «*пан магістар Францішак, сын нябожчыка пана Лукі Скарыны з Полацку, русін, на прапанаваныя яму раніцай гэтага дня пытаньні па мэдыцыне бліскуча адказваў па памяці і адхіліў выказаныя яму пярэчаньні, выдатна аргумэнтуючы, ён праявіў сябе найлепшым чынам. У сувязі з гэтым усімі там прысутнымі вучонымі з агульнай згоды ён быў ацэнены як падрыхтаваны і варты быць дапушчаным да асобага экзамэну па мэдыцыне*»

Падуанскі ўніверсытэт захаваў памяць пра Францішка Скарыну. У адну з аўдыторый, названай *Залай сарака*, змясьцілі сорак партрэтаў найбольш знакамітых выхаванцаў універсытэту. Партрэт Скарыны знаходзіцца ў другім шэрагу.




Франциск Скорина. Фреска в зале Сорока Падуанского университета. *Художник Джиакомо Форно.*

Перыяд 1513—1516 гадоў у жыцці Скарыны не асветлены дакументальнымі звесткамі, але менавіта ў гэты час ён надумаў пачаць кнігадрукаванне. 6 жніўня 1517 годуа ў Празе выйшла першая друкаваная беларуская кніга — «Псалтыр». Інтэнсіўная выдавецкая дзейнасць Скарыны ў Празе ў 1517—1519 гадах дазваляе думаць, што ён пасяліўся тут не пазней як у 1516 годзе. Агулам на працягу 1517—1519 гадоў Скарына пераклаў і выдаў 23 кнігі.


Починаютьсѧ песни давы
да пророка царѧ изра
илева кафисма
Псаломъ давъ
Блаженъ мужъ иже
не иде на совѣтъ нече
стивыхъ, и на пути
грешныхъ не ста, и на
седалищи губитель
не седе. Но въ законе
господни воля его, и въ
законе его поучитсѧ
день и нощь. И будеть яко древо сажденно
при исходищихъ водъ, иже плодъ свой да

## ПСАЛТЫР

Да кожнай кнігі Францішак Скарына пісаў прадмову, у якой распавядаў пра гісторыю стварэння кнігі, разважаў пра яе змест. Агульны аб' выданьняў — 1200 аркушаў.

За такі кароткі тэрмін немагчыма падрыхтаваць да выдання тэксты кніг і выканаць тэхнічныя задачы імастацкага афармленьня

Значыць, хутчэй за ўсё ў 1517 годзе ён ужо меў рукапіс поўнай Бібліі ў сваім перакладзе. Пра гэта ўскосна сведчаць спісы Скарынавых перакладаў, якія не ўвайшлі ў ягоную друкаваную Біблію. У Празе ён не паспеў выдаць кнігі пракрокаў, апрача прарока Данііла, і кнігі Новага Запавету.




ПРАГА З АТЛАСА ХАРТМАНА ШЭДАЛЯ

Каля 1520 году Францішак Скарына пераехаў у сталіцу Вялікага Княства Літоўскага Вільню.

Скарына заснаваў у доме Якуба Бабіча першую ва Ўсходняй Еўропе друкарню. У ёй каля 1522 году Скарына выдаў «Малую падарожную кніжыцу», якая злучае 21 тэкст: «Псалтыр», «Часасловец», «Акафіст жываноснай труне Гасподняй», «Канон жываноснай труне Гасподняй», «Акафіст арханёлу Міхаілу», «Канон арханёлу Міхаілу», «Акафіст Яну Прадвесьніку», «Канон Яну Прадвесьніку», «Акафіст Багародзіцы», і іншыя. У сакавіку 1525 года асобным выданьнем выйшаў «Апостал». Некаторыя часткі «Малой падарожнай кніжыцы», магчыма, выдаваліся асобнымі выпускамі. У Вільні Скарына выконваў функцыі сакратара віленскага біскупа Яна .



СКАРЫНА Ў ПРАЗЕ. ЛІТАГРАФІЯ А. КАШКУРЭВІЧА

У другой палове 1520-х гадоў Францішак Скарына ажаніўся з Маргарытай, удавою чальца Віленскага магістрата Юрыя Адверніка, які, пэўна, быў адным з фундатараў Скарынавай друкарні. Па звестках навукоўцаў, у іх было двое сыноў: Францішак і Сымон.

«*Маргарэта, суўласьніца выдатнага мужа Францішка, называемага доктар Скарынін*» успамінаецца ў познаньскім акце ад 23 кастрычніка 1529 года. Дакументальных пацверджанняў пра смерць Маргарыты няма, аднак у пазнейшых архіўных матэрыялах з 1532 года яе імя не згадваецца.

Пасля друку «Апостала» Скарына спыняе друкавецкую дзейнасць. Адной з прычын даследчыкі называюць той самы вялікі пажар.



ВІЛЬНА СЁННЯ.

Пасля 30-х гадоў 16 веку жыццё Францыска Скарыны складалася нялёгка. Суды са сваякасі жонкі, з крэдыторамі брата Івана пасля яго смерці, са спадчыннікамі Івана - не дадавалі яму настрою. Але дакладна не вядома, чаму Францішак Скарына пакінуў ВКЛ: судовыя скаргі скончыліся для яго шчасліва, а сам ён атрымаў шматлікія прывілеі, якія паляпшалі ягоны маёмасны стан. Асветнік мог працягваць службу ў біскупа Яна і выдавецкую дзейнасьць. Магчыма, пэўную ролю ў ад'ездзе адыграла эпідэмія, якая прыйшла ў Вільню. Францыск Скарына з сям'ёй вярнуўся ў Прагу.

У 1535 годзе кароль Чэхіі і Вугоршчыны Фэрдынанд надумаў стварыць у Празе батанічны сад, аднак у краіне не знайшлося садоўніка з неабходнымі ведамі. Пошукі садоўнікаў далі плён: у чэрвені 1538 года ў садзе ўжо працавалі чатыры мужчыны і жанчына. Адным з мужчын быў Ф. Скарына. Такім чынам, беларускі асветнік працаваў батанікам на Градчанах да 1539 года.

Чэскі храніст Вацлаў Гаек паведамляў пра пажар у Празе 2 чэрвеня 1541 года, у якім сярод іншых асобаў у доме адміністратара праскай епархіі Яна з Пухава згарэлі «кухарка Магдалена, а таксама хлопчык Францішак, сын колішняга доктара Руса» . Асветніка спасцігла яшчэ адное няшчасце — гібель сына. Год смерці, як і год нараджэння, вялікага беларуса невядомы. Па адных дадзеных ён памёр у 1541 годзе, па другіх – у 1551-м. Месца пахавання таксама невядома. У 2017 годзе даследчык Адам Мальдзіс выказаў здагадку, што Скарына мог быць пахаваны ў касцёле святога Віта ў Чэскім Крумлаве на поўдні Чэхіі.

Найбольш імаверна, што Скарына памёр у канцы 1551 году або ў студзені 1552 году. Захавалася «давераная грамата» караля Фэрдынанда I, выдадзеная 29 студзеня 1552 году:*«Мы, Фэрдынанд і г. д., абвяшчаем гэтай граматай, што колішні доктар Францішак Рус Скарына з Полацку, які некалі тут жыў, наш садоўнік — у гэтым каралеўстве чэскім быў чужаземцам — сышоў на вечны спакой і пакінуў пасьля сябе сына Сімяона Руса і пэўную маёмасьць, паперы, даўгі і іншае, яму належнае. І прасіў нас вышэйзгаданы Сімяон [выдаць] грамату і агульны ўказ на выпадак таго, што калі б ён знайшоў што-небудзь з маёмасьці вышэйзгаданага свайго бацькі, то каб яму была выдадзена і аказана дапамога».* Кароль задаволіў гэтую просьбу і загадаў усім службовым асобам Чэскага каралеўства дапамагаць Сімяону Скарыну ў такой справе. Сярод спадчыны асветніка названыя кнігі ды іншыя паперы.

*«Мы,*

*Фэрд*

# Францыск Скарына і наш час.

*“Усё здзейсненае  Францыскам Скарынай дазваляе лічыць яго самым выдатным айчынным асветнікам-гуманістамза ўсю шматвекавую гісторыю нашай Бацькаўшчыны. Хаця біяграфія  яго і да нашага часу мае яшчэ многа загадак і таямніц. Тым не меншнават тое, што нам вядома, надзвычай ураджвае, па-добраму здзіўляе і дае усе падставы шчыра захапляцца веліччу, глыбінёй і шырынёй усяго здзейсненага. “*

*Дубянецкі Э.С.*

# ПАМЯЦЬ ЖЫВЕ!

Імем Францыска Скарыны названы вуліцы Ў Мінску, Полацку, Віцебску, Нясвіжы, Оршы і іншых гарада. Уведзена вышэйшыя дзяржаўныя ўзнагароды Беларусі – медаль Францыска Скарыны (1989) і ордэн Францыска Скарыны (1995):








Кнігі Францыска Скарыны ў музеі Нацыянальнай бібліятэкі.

# У наш час у 11 краінах свету захоўваюцца 520 асобнікаў праскіх і віленскіх выданьняў Францішка Скарыны. У Беларусі іх 28 (5,4%). У ва Ўкраіне захоўваецца 47 кніг, у Польшчы — таксама 28. Найбольшая колькасць выданняў Скарыны цяпер знаходзіцца ў Расеі — 352 асобнікі або 68% усіх вядомых кніг.

Увогуле, на пачатак XX ст. на тэрыторыі Беларусі не засталося арыгіналаў кніг Скарыны. Толькі ў 1925 годзе Дзяржаўная і ўніверсітэцкая бібліятэка БССР (будучая Нацыянальная бібліятэка) набыла 10 выдадзеных у Празе кніг у ленінградскага бібліяфіла Камарніцкага. Гэтая колькасьць заставалася нязменнай да 2017 года, калі «Белгазпрамбанк» выкупіў для сваёй прыватнай калекцыі «Малую падарожную кніжыцу» (18 кніг у адным пераплёце).



# ПОМНІКІ ФРАНЦЫСКУ СКАРЫНЕ Ў БЕЛАРУСІ І ПРАЗЕ.











Але галоўнае – гэта кнігі аб Францыску Скарыне. Асаблівай увагі заслугоўвае энцыклапедычны даведнік “Францыск Скарына і яго час” .. Роўнага яму выдання пакуль што ў Беларусі няма.  А для Астрыны ён адметны яшчэ і тым, што ў яго падрыхтоўцы і выданні прымаў ўдзел наш зямляк, навуковец , які нарадзіўся ў в. Сасновы Бор Шчучынскага раёна. Вітар Іванавіч Дарашкевіч. Увесь калектыў  быў удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР і Віктар Іванавіч у тым ліку.











ФРАНЦЫСКА СКАРЫНУ

дакумента. Прапушчаныя або недапісаныя словы дапоўнены ў тэксце і ўзяты ў квадратныя дужкі. Некаторыя тэрміны, якія звязаны са складам, зместам і асаблівасцямі тэкстаў дакументаў ці патрабуюць дадатковай інфармацыі, тлумачацца ў каментарыях, што змешчаны ў канцы раздзела і пазначаны адпаведнай лічбай. Падрыхтоўка дакументаў і каментарыі да іх зроблены канд. філал. н. В. І. Дарашкевічам. Пераклад тэкстаў В. І. Дарашкевіча (дакументы № 2, 4—7, 9, 20—23, 42, 46, 50); В. І. Дарашкевіча і А. А. Жлутко (дакументы № 8, 10, 12—19, 24—32, 47, 48, 52); В. І. Дарашкевіча і Т. М. Кароткай (дакумент № 45); В. І. Дарашкевіча і І. І. Лучыц-Федарца (дакументы № 43, 53); В. І. Дарашкевіча і Л. П. Ляхавай (дакументы № 3, 33, 34, 44); В. І. Дарашкевіча і В. П. Маслюка (дакумент № 51); В. І. Дарашкевіча і Г. А. Скакун (дакументы № 37—41).



*Літ.:* 564; 792. *У. М. Конан, В. Ф. Шматаў.*

**ДАРАШКЕВІЧ** Віктар Іванавіч (н. 1949), беларускі сав. літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1977). Працуе ў Ін-це л-ры імя Янкі Купалы АН БССР. Даследуе гісторыю бел. стараж. л-ры. У манаграфіі «Новалацінская паэзія Беларусі і Літвы. Першая палавіна XVI ст.» (1979) значную ўвагу аддаў характарыстыцы творчай дзейнасці С., паказу яго ролі ў развіцці ўсх.-слав. кнігадрукавання і слав. л-р, тыпалагічнаму супастаўленню рэнесансава-гуманіст. светапогляду і творчасці С. і паэтаў-лацініст. Беларусі 16 ст. У арт. «Францыск Скарына і Мікола Гусоўскі» (Неман. 1979. № 1), паслясловіі «Паэма жыцця» да выдання «Песні пра зубра» Гусоўскага (1980) разгледзеў пытанне вытокаў і своеасаблівага светапогляду С. і Гусоўскага як гуманістаў. У арт. «Традыцыі «Слова аб палку Ігаравым» у беларускай літаратуры XVI ст.» (Весці АН БССР. Сер.

…га ліста кнігі «Прарок Данііл» Ф. Скарыны.

# ГЭТЫЯ КНІГІ АБ СКАРЫНЕ ЁСЦЬ У ФОНДЗЕ НАШАЙ БІБЛІЯТЭКІ:






# ВЫКАРЫСТАНЫЯ КРЫНІЦЫ:


1. Дубянецкі Э. Асветнікі Беларусі: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына / Эдуард Дубянецкі– Мн.: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі , 2016 – 71 с.
2. Клышка А . Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга./Анатоль Клышка - Мн.:Полымя, 2000. – 92 с.
3. Слаўны сын беларускага народа: Кніга пра Скарыну. – Мн.: Юнацтва, 1994. – 252 с.
4. Суша А.  Францыск Скарына: Частка 3. Чалавек – легенда. /Алесь Суша – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016 -108 с.

1.Францыск Скарына і яго час: Энцыклапедычны даведнік. – Мн.: Выдавецтва “Беларуская Савецкая энцыклапедыя. -  1988 – 606 с.

2.

# ШЧЫРА ДЗЯКУЕМ ЗА ЎВАГУ!

